# 2022 год
# ЮБІЛЕЙ ПЕРШАГА ВЫДАННЯ

Звесткі з архіва
Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі

*Кніга, як і чалавек, мае дату нараджэння – год, калі яна ўпершыню была апублікавана. І, канешне, у кніг бываюць юбілеі, а яны, як вядома, з’яўляюцца своеасаблівымі каталізатарамі ўспамінаў і служаць нагодай для таго, каб звярнуць увагу на выдатныя старонкі гісторыі літаратуры і кнігадрукавання і ўвогуле ацаніць «базу даных» культурнай спадчыны, асэнсаваць яе ўнікальнасць.*

*У гэтай рубрыцы прадстаўлена інфармацыя аб мастацкіх творах класікаў беларускай літаратуры, першыя выданні якіх захоўваюцца ў архіве Нацыянальнай кніжнай палаты Беларусі і для якіх 2022 год з’яўляецца юбілейным.*

# 95 гадоў

**Чарот, М. Беларусь лапцюжная : Поэма / М. Чарот. – Мінск : Беларускае дзяржаўнае выдавецтва, 1927. – 30 с.**

**Паэма была напісана ў 1924 годзе. У ёй паказана паслярэвалюцыйнае абнаўленне жыцця, збліжэнне горада і вёскі.**
**Тыраж першага асобнага выдання паэмы – 3000 экзэмпляраў. Пазней друкавалася ў зборніках твораў паэта.**



# *«Беларусь лапцюжная»:* 95 гадоў



*Міхася Чарота (сапраўднае імя Кудзелька Міхаіл Сымонавіч) называюць «класікам беларускага паэтычнага авангарду», а яго творы, напісаныя ў 1920-я гады, у тым ліку і паэму «Беларусь лапцюжная», характарызуюць як выключна наватарскімі ў беларускай літаратуры.*

# 95 гадоў

*«Лапцюжнікі» Міхася Чарота – гэта вясковая бедната, якая актыўна пачынае асвойваць горад. «Збліжэнне горада і вёскі, гэты новы этап паслярэвалюцыйнага абнаўлення жыцця, Чарот малюе як той гістарычны пералом, на якім тады знаходзілася Беларусь. Пераломны момант гістарычнага змагання за Беларусь ён увасабляе ў вобразах чырвонага каня з усходу, на якім едзе «працы рыцар», і белага заходняга каня, у якога «надломаны капыты» і на якім «хістаецца яздок». Як можна заўважыць, перавага на баку чырвонага каня з усходу. Будучыня Беларусі бачыцца паэту толькі ў сувязі з перамогай «рыцара працы» на чырвоным кані».*

*С. М. Шчэрба*

*Прачытаць паэму Міхася Чарота «Беларусь лапцюжная» можна на сайце беларускай электроннай бібліятэкі «Беларуская палічка»:*

*ttps://knihi.com/Michas_Carot/Bielarus_lapciuznaja.html*